2. **Полное** собрание русских летописей / Ин-т истории СССР. – Москва : Наука, 1975. – Т. 32 : Хроники: Литовская и Жмойтская, и Быховца. Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного. – 233 с.

3. **Полное** собрание русских летописей / Ин-т истории СССР. – Москва : Наука, 1980. – Т. 35 : Летописи белорусско-литовские. – 306 с.

4. **Dlugossi, I.** Annales seu cronicae incliti regni Poloniae. Liber nonus / I. Dlugossi. – Varsavie : Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1978. – 509 p.

5. **Kronika** polska, litewska, zmodzka i wszystkiej Rusi Macieja Stryjkowskiego : w II t. – Warszawa : Nak. G. L. Glüsksverga, 1846. – T. II. – 572 s.

6. **Kronika** Polska Marcina Bielskiego. Nowo przez Ioach. Bielskiego, syná iego, wydána. – Kraków : w drukárni Jákubá Sibeneycherá, 1597. – 804 s.

7. **Kronika** polska Marcina Kromera biskupa warmińskiego ksiąg XXX: dotąd w trzech językach, a mianowicie w łacińskim, polskim i niemieckim wydana, na język polski z łacińskiego przełożona przez Marcina z Błażowa Błażowskiego i wydana w Krakowie w drukarni M. Loba roku 1611 : w II t. – Kraków : Księgarnia J. M. Himmelblaua, 1882. – T. I. – 740 s.

8. **Pfister, C.** Climate and society in Europe – the last thousand years / C. Pfister, H. Wanner. – Bern : Haupt verlag, 2021. – 396 p.

Сумко А.В. *(г. Полацк)*

ЭКСТРЭМАЛЬНАЯ ГАСТРАНАМІЯ ПАВАЕННАЙ ВІЦЕБШЧЫНЫ (па матэрыялах палявых даследаванняў)[1]

Геаграфія даследавання – сучасная тэрыторыя Віцебшчыны, якая ў пасляваенны час складалася з дзвюх абласцей: Полацкай (існавала з 1944 па 1954 г.) і Віцебскай. Рэгіён меў у сваім складзе раёны з рознымі тыпамі сацыяльна-эканамічнага ўкладу (раёны з перавагай аднаасобных гаспадарак і цалкам калектывізаваныя раёны), розным узроўнем дабрабыту насельніцтва і неаднолькавымі стартавымі ўмовамі пасляваеннага аднаўлення. Прадмет даследавання – вырашэнне праблемы харчовага забеспячэння вясковага насельніцтва Віцебшчыны ў першыя гады пасля вызвалення ад нацысцкіх захопнікаў.

Матэрыялы вуснай гісторыі Віцебшчыны і архіўныя дакументы фіксуюць, што рэчаіснасць у гэты перыяд была надзвычай складанай, у першую чаргу для насельніцтва, якое пражывала ў раёнах, якія сталі эпіцэнтрам карных экспедыцый. Шэсць раёнаў Полацкай вобласці (Асвейскі, Ветрынскі, Дрысенскі, Полацкі, Расонскі, Ушацкі) і сем раёнаў Віцебскай (Гарадоцкі,

[1] Артыкул падрыхтаваны ў рамках праекта БРФФД «Стратэгіі выжывання і адаптыўныя практыкі вясковага насельніцтва Паўночнай Беларусі ў пасляваенны перыяд», дамова № Г23ИП-037.

Дубровенскі, Сіроцінскі, Суражскі, Чашніцкі, Лёзненскі, Мехаўскі) былі ўключаны ў лік 36 найбольш пацярпелых ад нацыстаў на тэрыторыі БССР [15, л. 10]. У архіўных дакументах вызначаліся агульныя рысы штодзённасці на спустошанай тэрыторыі: «…на момант вызвалення пасяўныя плошчы складалі не больш 27% да 1940 года, коней засталося 13%, у асабістым карыстанні калгаснікаў хатняй жывёлы засталося 14% да даваеннай колькасці. Насельніцтва галадавала, мелася вялікая колькасць знясіленых…» [15, л. 29]. Пра крытычны недахоп базавых прадуктаў харчавання ўзгадвалі амаль усе рэспандэнты з найбольш пацярпелых раёнаў Віцебшчыны і адзначалі, што ў ежу выкарыстоўвалася ўсё, што можна было есці. У надзвычайным становішчы апынуліся тыя, хто вяртаўся з нямецкага палону або эвакуацыі, таму што яны не мелі ўласных харчовых запасаў і не маглі разлічваць на ўраджай са сваёй сядзібы. Акрамя гэтага, трэба згадаць, што пэўны прамежак часу сем'і былі раздзелены падчас ваеннага ліхалецця, сустракаліся выпадкі, калі дзеці засталіся сам-насам з праблемамі элементарнага жыццезабеспячэння. Успаміны пра гэта фіксуюцца ва ўсходняй і заходняй частках Віцебшчыны: *«После вайны голад. Сабіралі мёрзлую картошку і дабаўлялі весной траву с красненькімі галоўкамі, потым мы эта голадам звалі. Елі маладые лісточкі ліпы, корень аіра, все, что можно, то і елі»* (Пастаўскі р-н) [1]; *«Мы прыехалі з сястрой на чыстае поле... Прыйшлі з лесу так і пашлі ў калхоз.* (Вы ж маленькія былі. – *А. С.*) – *А там не глядзелі, што мы маленькія былі. Мы ж семяну прыносілі з Полацка, як зажывалі калхоз после вайны, сеяць-то нечым было. Вот сперва шэсць чалавек за плугом становяцца, аром, узаралі кусочак, на заўтра ідём за семяной. Вот мне было 15 гадоў, я хадзіла ў Полацк, мне пуд семяны на плечы»* (Расонскі р-н) [2].

Экстрэмальная сітуацыя з харчаваннем прывяла да рэзкага скарачэння неабходнай колькасці раслінных і жывёльных прадуктаў у сутачным рацыёне вясковай сям'і і, як вынік, недаатрымання неабходных для здароўя чалавека рэчываў. Пашыраным было выкарыстанне ў ежу розных раслінных сурагатаў. Дзікарослыя расліны ва ўмовах недахопу базавых прадуктаў з'яўляліся адным з неабходных для жыццядзейнасці арганізма рэсурсам. Гэта значна павялічвала ролю збіральніцтва ў сістэме жыццезабеспячэння пасляваеннай беларускай вёскі, прычым рэестр раслін, якія выкарыстоўваліся ў якасці харчовага дадатку, значна павялічыўся за кошт тых зёлак і раслін ці іх частак, якія ва ўмовах адноснага дабрабыту не выкарыстоўваліся (кара дрэў, канюшына, шчавульнік, асака, лебяда, хвошч, кісліца і інш.) [16].

Матэрыялы вуснай гісторыі Віцебшчыны фіксуюць, што ўключэнне ў паўсядзённы пасляваенны рацыён раслінных прадуктаў было вельмі пашырана. Са шчаўя, лебяды і іншай травы пяклі аладкі ці проста варылі: *«Мама хадзіла па полі, шчаўе дзікі збірала, аладкі пякла, і елі»* [3]; «*З клевера прыснакі – макушкі рвалі і прыснакі такія пяклі. Мама прыдумляла і пякла. ...адзін ат аднаго вучыліся, не адны ж мы былі...»* [4]; *«Кісліца і крапіва –*

гэта не беда, асот елі! Насморгаем лісцікаў, зварым, ёсць чым – прыбелім, а нет, і так хлебалі» [5].

Вельмі распаўсюджаным, пераважна ў вясновы перыяд, было ўжыванне ў ежу крапівы: *«Крапіву сабіралі, елі. Крапіўка малодзенькая, яна укусная. Калі я тут пайшла, гляджу – крапіва расцець, после вайны, кажу, ужо б абадралі, а цяпер зарастаець»* [6]. Прадукты збіральніцтва давалі неабходныя бялкі і вітаміны, што дазваляла пэўным чынам выправіць дысбаланс у сістэме харчавання. Напрыклад, тая ж крапіва, што з'яўляецца своеасаблівым прыродным полівітамінным канцэнтратам, давала арганізму пэўную долю аскарбінавай кіслаты, вітамінаў К, В2 і іншых карысных рэчываў, а насенне крапівы змяшчае да 32,4% тлустага алею [17]. Багатым на крухмал, эфірны алей і аскарбінавую кіслату было карэнне аіра, якое таксама спажывалі ў ежу.

Акрамя травы, якую збіралі з вясны, распаўсюджаным харчовым рэсурсам былі разнастайныя ягады і грыбы – тое, што немагчыма было здабыць на ўласных палетках. Уключэнне ў паўсядзённы пасляваенны рацыён дзікарослых раслін і раслінных прадуктаў-сурагатаў фіксуецца не толькі ў раёнах, якія найбольш пацярпелі ад акупацыі і ваенных дзеянняў, але і па ўсёй тэрыторыі Віцебшчыны, адрознівалася толькі ступень спажывання. *«Лебяду елі і бульбу дзе мёрзлую – ўсякае бывала»* (Мёрскі р-н) [7]; *«Што мы елі? Вот вясной сабіралі шчавель. Ну, праўда, у нас после вайны асталася карова жывая... Пашлі, набралі, прынеслі. А есць та хочацца! Пака сабіралі – наеліся. Жываты вот такія вот, а есці ўсё роўна хочацца. Ну зварым шчаўлю гэтага. Хто забеліць смятанай там якой, ці малаком кіслым… чым прыходзілася. Бульбы звараць. Ну і можна сказаць, так і паелі. Пяклі з жмыха, што атходзіць ад алею, такія какорыны, пяклі і елі. Хлеб рэдка быў»* [8].

У першыя гады пасля вызвалення самым «хадавым» прадуктам была бульба, якая засталася на палях пасля ўборкі ўраджаю. «[Вайна закончылася. Хата ёсць. Каровы нету, нічога нету. Як жылі?. – *А. С.*] – *Так і жылі. І бульбу збіралі гнілую. У нас былі Хаменічы, во яны і цяпер там… У іх калхоз быў – адна дзярэўня. І яны ўпашуцца заранее, не знаю, коні ў іх былі і дзе яны што бралі, і ў іх бульба была. Дык мы хадзілі збіраць на іх поле. Матка назбіраець карзіну, тады мы яе лупім, памыем, усё раўно ясі і пясок…»* [9]. З перазімавалай бульбы пяклі бліны, дадаючы да яе трохі звычайнай мукі ці, іншы раз, муку з дзікарослых раслін: *«Голадна пасля вайны. Калхознае поле ўберуць, а вясной мы ідем, звалі парулі, сабіралі гнілую картошку і пяклі бліны. Траву – лебяду… Делалі з лебяды муку, сушылі і ў бульбу гэту…»* [10]. Трэба адзначыць, што некаторыя рэспандэнты падчас інтэрв'ю падкрэслівалі, што ежу, якую гатавалі з гнілой бульбы, называлі «ташноцікі»: *«Ташноцікі – гэта каторая перазімавала, каторая ўжо згніла, зімой жа марозы былі, яна ўжо… і такую елі… Ташноцікі – крухмальная была. І елі і нічога, ніхто не памер»* [11]. Іншыя ўзгадвалі пра смакавыя адчуванні дадзенай стравы: *«Пасля вайны такія смачныя дранікі з мерзлай бульбы былі, ну, яна сладкая была»* [12].

Пасляваенны хлеб – гэта тэма асобнага даследавання. Рэспандэнты вельмі кранальна ўспаміналі пра яго: *«Я шчаўля пахлебаю без хлеба, хлеба нет, іду в школу, а дарога мая возле пекарні, как запахнець хлебам, а мяне такая слабасць агарнець, не магу з месца сыйсці»* [13]. Пасляваенны хлеб у асноўным складаўся з розных дабавак: «*Хлеб пяклі, але слаба хлеба там было, бульбу дабаўлялі»* [13].

Калі размова ішла пра сістэму харчавання, то рэспандэнты адзначалі, што вельмі бракавала солі, што ўвогуле было адметнай з'явай для ваенных і першых пасляваенных гадоў. Кожная сям'я па-свойму выходзіла з сітуацыі. Напрыклад, сустракаліся аповеды пра тое, што ў ежу выкарыстоўвалі калійную соль: «[І выменівалі гэту рыбу на гэту соль красную, дык гэта ж… а яна не едавітая?] *Жылі асталіся і жівем цяпер, не знаю, каб цяпер засаліў яе, дык можа і памер, дык тады і добра было, можа тады не такая была ядавітая яна, хто яе знаіць»* [2]. Іншы раз выварвалі дошкі ад скрынь, дзе калісьці было салёнае сала: «[А соль?] *Не было. Даже яшчыкі выварвалі, дзе когда-то да вайны салілі сала, но і прапітанае соллю – пасеклі і ў чыгун, пакіпяцілі»* [11].

Некаторыя рэспандэнты казалі пра тое, што захавалі ў памяці і пранеслі праз усё жыццё смакавыя адчуванні пасляваеннай гастраноміі. Матэрыялы вуснай гісторыі дапамагаюць зразумець, як вясковае насельніцтва вырашала праблемы пасляваеннага жыццезабеспячэння.

ЛІТАРАТУРА

1. **Архіў** Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай : экспедыцыя 2017 г. / запісала А. Сумко ад жыхаркі вёскі Васіліны Пастаўскага р-на.

2. **Архіў** Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай / запісала А. Сумко ад жыхаркі (1928 г. н.) вёскі Янкавічы Расонскага р-на.

3. **Архіў** Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай : экспедыцыя 2022 г. / запісалі студэнты: Ю. Згірскі, П. Голубева, К. Антонава ад жыхаркі (1937 г. н.) вёскі Новы Пагост Міёрскага р-на.

4. **Архіў** Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай / запісала А. Сумко ў 2022 г. ад жыхаркі (1940 г. н.) вёскі Рай Сенненскага р-на.

5. **Архіў** Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай / запісала А. Сумко ў 2019 г. ад жыхаркі (1937 г. н.) вёскі Горспля Расонскага р-на.

6. **Архіў** Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай / запісала А. Сумко ў 2019 г. ад жыхаркі (1935 г. н.) вёскі Галоўчыцы Расонскага р-на.

7. **Архіў** Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай : экспедыцыя 2022 г. / запісалі студэнты:

І. Глінскі, В. Зайцава, К. Антонава ад жыхаркі (1943 г. н.) вёскі Новы Пагост Міёрскага р-на.

8. **Архіў** Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай : экспедыцыя 2021 г. у Браслаўскі раён / запісалі студэнты: Ю. Згірскі, Д. Бабоўскі ад жыхаркі (1938 г. н.) вёскі Слабодка (Пунькі – нар.).

9. **Архіў** Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай / запісала А. Сумко ў 2022 г. ад жыхаркі (1937 г. н.) вёскі Немойты Сенненскага р-на.

10. **Архіў** Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай / запісала А. Сумко ў 2023 г. ад жыхара (1941 г. н.) вёскі Старое Лядно Лепельскага р-на.

11. **Архіў** Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай / запісала А. Сумко у 2022 г. ад жыхаркі (1927 г. н.) вёскі Немойты Сенненскага р-на.

12. **Архіў** Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай / запісала А. Сумко ў 2018 г. ад жыхаркі (1941 г. н.) вёскі Жыгулі Верхнядзвінскага р-на.

13. **Архіў** Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай / запісала А. Сумко ў 2021 г. ад жыхаркі (1932 г. н.) вёскі Барсукі Верхнядзвінскага р-на.

14. **Архіў** Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай : экспедыцыя 2017 г. / запісала А. Сумко ад жыхаркі (1942 г. н.) вёскі Каліты Пастаўскага р-на.

15. **Нацыянальны** архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 4-п. Воп. 29. Спр. 267.

16. **Сумко, А. В.** Збіральніцтва ў сістэме жыццезабеспячэння пасляваеннай беларускай вёскі / А. В. Сумко // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А, Гуманитарные науки. – 2021. – № 1. – С. 178–184.

17. **Шмярко, Я. П.** Лекавыя расліны ў комплексным лячэнні / Я. П. Шмярко, І. П. Мазан. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – С. 219.

Титова Н.И. *(г. Витебск)*

КРУТЫЕ ВИРАЖИ ЛЕТЧИКА МИХАИЛА БАРАНОВСКОГО

В первый день нового 1909 г. у крестьянки из небольшой деревушки Каменка Сенненского уезда Могилевской губернии Натальи Захаровны Барановской была большая радость: у нее родился первенец. Мальчика назвали в честь отца, который отказался дать сыну свою фамилию, – Михаилом. Ребенок носил фамилию матери – Барановский.

Хозяйство у родителей было небольшое: 4 десятины земли, лошадь да корова, – но жить было можно. В 1914 г. в семье родилась дочь Надежда.